*Фёдар Рацык*

# ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД МОТАЛЯ Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ І ЭДЫЦЫЯХ XIX – XXI СТАГОДДЗЯЎ

Першы пісьмовы ўспамін пра Моталь як прыватнае ўладанне змяшчаецца ў актах Літоўскай метрыкі і датаваны 1422 годам. Пазней, атрымаўшы Магдэбургскае права (1555), Моталь у розны час уваходзіў у склад Пінскага княства і павета, Кобрынскага і Драгічынскага паветаў, а сёння – уваходзіць у пералік паселішчаў Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці [1]. Сучасныя электронныя крыніцы паведамляюць: «З даўніх часоў Моталь – вядомы цэнтр…, дзе з пакалення ў пакаленне займаліся вырабам скур на абутак і адзенне, а таксама славутых далёка за межамі нашай краіны мотальскіх кажухоў… Усе… напрамкі мастацкай творчасці народа атрымалі тут свае асаблівыя рысы, якія выразна адрозніваюцца ад аналагічных рашэнняў не толькі ў Беларусі, але і ў суседніх рэгіёнах …» [2]. Ужо працяглы час няспынную ўвагу аматараў і даследчыкаў народнай творчасці выклікаў мясцовы вясельны звычай, найбольш цікавая і адметная частка якога – каравайны абрад. Фальклярыстычныя і краязнаўчыя даследаванні і эдыцыі, прысвечаныя мясцоваму веселлю, перыядычна з'яўляюцца з XIX стагоддзя, відазмяняюцца пад уплывам зменаў у сацыякультурнай сферы побыту беларусаў і набываюць новыя аспекты.

Першая дакументальная фіксацыя вясельнага абраду мястэчка Моталь была зроблена невядомым падарожнікам па Палессі і апублікавана ў часопісе «Віленскія ведамасці» ў 1856 годзе. Аўтар пабываўшы адразу на двух веселлях, для сябе адзначыў што маталяне шырока выкарыстоўваюць у сваей абрадавай дзеі песні і што кожная песня мае свой глыбокі сэнс у кожнай частцы дзейства. Такі ж самы вынік зрабіла даследчыца Марыя Саковіч (прыкладна 1865–1907) – вядомая збіральніца палескага фальклору, настаўніца народнага вучылішча ў вёсцы Моладава, што побач з Парэччам, член-карэспандэнт Імператарскага Рускага геаграфічнага таварыства. Ёю ў 1888 годзе была апублікавана праца «Сяляне мястэчка Моталь іх песні». У гэтай працы былі запісаны усе песні вясельнага цыкла, побытавыя, лірычныя і каландарна-абрадавыя якія бытавалі ў той час у мястэчку. Рашэннем камісіі па справах этнаграфіі праца была перададзена на апрацоўку кампазітару Балакіраву Мілію Аляксандравічу, які зрабіў нотны запіс гэтых песень, што дазваляе іх узнавіць. Нажаль, праца не была надрукавана, застаўся толькі рукапісны варыянт, фотакопіі якога захоўваюцца ў Мотальскім музеі народнай творчасці.

Са з'яўленнем фотатэхнікі фіксацыя такіх знакавых момантаў жыцця чалавека як веселле набыла вельмі важнае значэнне. Пачынаючы з 1927 года ў Моталі распачаў фотапаперу Аляксей Мінюк. Першы фотаапарат ен зрабіў сам з лінз акуляраў, фотабумагу купляў ў Пінску, альбо замаўляў у яўрэяў, якія у той час жылі ў Моталі. Яго запрашалі на вяселлі, прыходзілі самі маладзены, запрашалі гасцей. Па здымках таго часу можна высветліць якая вопратка была ў маладых, як выглядаў каравай, якія рушнікі павязваліся на сватоў. Фатаграфіі Аляксея Мінюка з'яўляюцца вялікай дакументальнай гістарычнай і мастацкай каштоўнасцю, перыядычна выстаўляюцца ў экспазіцыях музеяў Беларусі (мал. 1).





*Малюнак 1* – Афіша фотавыставы А.Мінюка, прысвечанай Моталю (2013)
і фотаздамак каравайнага абраду маталян (2011)

З паляпшэннем жыцця маталян і падзеннем «жалезнай заслоны» ў побыт вельмі хутка ўвайшлі відэакамеры. Прастата карыстання імі дазваляла праводзіць здымкі вяселля больш дасканала, чым з дапамогай фотатэхнікі. Пачынаючы з канца 1980-х кожная паважаючая сябе маладая сям'я лічыла патрэбным мець відэа-касэту са сваім вяселлем.

Пачынаючы з пачатку XXI стагоддзя развіваюцца тэндэнцыі занядбання выкарыстання традыцыйнай вясельнай абраднасці. Таму есць свае прычыны. Галоўнай можна лічыць эканамічную. Менавіта яе трэба падвяргаць крытыцы. З паляпшэннем якасці жыцця каштоўнасці дабрабыту выцясняюць каштоўнасці папярэдніх пакаленняў. Як нам кажа народная мудрасць: «Чалавека успамінаюць за жыцце тры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разы – калі родзіцца, калі жэніцца і калі памірае». Вяселле мае на мэце стварэнне новай сям’і, працяг роду. На сенняшні момант гэтыя пункты маюць толькі павярховае і фармальнае значэнне.

Спробы захавання традыцыйнай вясельнай абраднасці распачаліся ў канцы 1970-х гадоў. Пры рэгістрацыі шлюбу маладых пачалі «ставіць на ручнік», гэта сімвалізавала пачатак новага сумеснага жыцця маладой пары. Таксама пачало практыкавацца асыпанне маладых зернем з перамешанымі у ім манетамі. Асыпанне суправаджалася прыгаворам-замоваю: «Сыплю на вас жыто, коб добрэ вам жыты / Шэ і пшэныцу яру, коб гора нэ зналы / Сыплю на вас просо коб добрэ жылосо / Сыплю на вас овэс, коб гонорыўса вамы рыд увэсь».

З пачатку 1980-х на мастацкай самадзейнасці пачалі вылучацца калектывы, якія ўключалі ў свой рэпертуар песні абрадавых цыклаў і лірычныя пазаабрадавыя песні. Часам выступы суправаджаліся пастаноўкамі на тэму сялянскага жыцця і звычаяў. Такім прыкладам можна прывесці групу жанчын з трэцяй комплекснай брыгады на той час калгаса «40 год Кастрычніка». Актыўнымі удзельніцамі гэтага гурта была здзейснена спроба паказаць на сцэне абрад з каравем, з песнямі і яго сімволікай. Атрымаўшы падтрымку на мясцовым ўзроўні, гэты гурт быў накіраваны на раённыя спаборніцтвы ў Іванава. Заняўшы там першае месца ўдзельніцы потым выступалі ў Пінску і ў Брэсце. Гурт знік з распадам СССР.

У пачатку 1980-х на базе літаратурнай гасцёўні пачаў ствараццa этнаграфічны тэатр «Мотальскія суседкі». Кіраўніком тэатра доўгі час з'яўлялася дырэктар Мотальскага музея народнай творчасці Вольга Рыгораўна Мацукевіч. У тэатры паказвалі розныя гісторыі з паўсядзеннага жыцця мястэчка. Не абміналі ў сваіх пастаноўках і абрадавых дзеяў. Так удзельнікі тэатра прымалі ўдзел у здымках дакументальнага фільма этнамузыколага і аўдыёвізуальнага антраполага Зінаіды Якаўлеўны Мажэйкі «Палескія вяселлі» ў 1984 годзе; здымаліся ў стужках, падрыхтаваных даследчыцай фальклору і журналістам Рэгінай Станіславаўнай Гамзовіч «Мотальскае вяселле», «Абрад Свахі», «Пераблытанка» (мал. 2).

На сучасным этапе Мотальскі музей народнай творчасці сумесна з Іванаўскім раённым выканаўчым камітэтам дамагацца ўключэння абрада «Каравай» у Спіс аховы нематэрыялай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Таксама Мотальскі музей народнай творчасці прапануе ўступаючым ў шлюб маталянам і гасцям вёскі правесці яго рэгістрацыю па традыцыйных правілах ў сценах музея (мал. 1).

Такім чынам, вясельны абрад маталян прайшоў пэўную эвалюцыю ў сваім станаўленні: ад сціплых *тэкставых апісанняў* і *нотных фіксацый асобных абрадавых напеваў* (мяжа XIX – XX стст.), праз эпізадычную *фота-* і *відэафіксацыю* ў фотападборках этнографаў і фільмах па аўдыёвізуальнай антрапалогіі (сяр. XX ст.), да падрабязнай фіксацыі ў *мэтанакіравана адснятай кінадакументалістыцы* і спецыяльна падрыхтаваных наборах *дакументаў для атрымання імі статусу нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці* (мяжа XX – XXI стст.).




*Малюнак 2* – Сцэны з дакументальных этнаграфічных фільмаў «Абрад Свахі» і «Палескія вяселлі» (1984) з удзелам маталян


**Спіс літаратуры:**

1. Выставка «Палескае мястэчка: Моталь» в Минске [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://afisha.tut.by/exhibition.php?eid=2042. – Дата доступу : 12.03.2014.
2. Федарук, М. «Посвіты, Божэ, з Раю нашому короваю…» / М. Федарук [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.janow.by/publikaczii/rodnaya-zemlya/1497-posvity-bozhe-z-raju-nashomu-korovaju.html . – Дата доступу : 12.03.2014.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ